■ Песню бярыце з сабою...

Рубрыку вядзе
Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com

АЗ, БУКІ І ВЕДЗІ

Сённяшняя субота — незвычайная, асаблівая. Для многіх першакласнікаў, іх бацькоў яна запомніцца на ўсё жыццё — урачыстай лінейкай, кветкамі, першай настаўніцай, школьным званком...
У гэты святочны дзень ведаў я рады прапанаваць новую песню на вершы выдатнага паэта Анатоля Вярцінскага.

Вершы — Анатоль Вярцінскі, музыка — Яўген Ксяневіч



Куплет 1:

Сумна не ведаць
нічога на свеце,
Жыць жыццём цёмных лясоў.
Дзень добры, аз, букі і ведзі!
Усе пачынаецца з вас, з азоў.

Прыпеў:

Бывайце, мішкі, каты ды мышкі.
Бывай, першабытны дзіцячы свет.
Дзень добры, першыя мае кніжкі!
Дзень добры, першы веласіпед!

Куплет 2:

Дзень добры, кніжкі мае другія,
Таксама трэція кніжкі мае!
Дзень добры, настаўнікі дарагія!
Вучыце! — Мне ведаў не стае.
Прыпеў 2 разы

Перамены ў тэнісе

Адбыўся сход Генеральнай асамблеі Міжнароднай тэніснай федэрацыі.

На ім прайшло галасаванне за шэраг трансфармацыйных рэформаў у дачыненні Кубка Дэвіса, якія ITF плануе правесці сумесна з міжнародным холдынгам Kosmos. Пачынаючы з 2019 года ў фінальнай частцы спаборніцтваў будуць удзельнічаць 18 наймацнейшых зборных, і найлепшыя гульцы свету на працягу аднаго тыдня будуць змагацца за чэмпіёнскі Кубак Дэвіса. Першы турнір у падобным фармаце пройдзе з 18 да 24 лістапада, а ў якасці прымаючага боку разглядаюцца іспанскі Мадрыд і французскі Ліль — першы горад-гаспадар будзе абвешчаны на працягу найбліжэйшых тыдняў.

Прэзідэнт ITF Дэвід ХАГЕРЦІ пракаментаваў новаўвядзенні: «Я вельмі рады, што ўдзельнікі сёння прагаласавалі за абарону доўгатэрміновых перспектыў Кубка Дэвіса. Прагаласаваўшы за гэтыя рэформы, сумесна з Kosmos мы зможам рэалізаваць велізарны патэнцыял турніру і вывесці яго на новы ўзровень. Наша мэта — забяспечыць умовы, каб гэта гістарычнае рашэнне прынесла карысць будучым пакаленням гульцоў на дзясяткі гадоў наперад».

Новаўвядзенні прынясуць значны рост даходаў для тых краін, якія будуць прымаць турнір, а новы прызавы фонд у памеры 20 мільёнаў долараў для гульцоў падыме Кубак Дэвіса да ўзроўню турніраў Вялікага шлема. Новы фармат будзе ўключаць у сябе адборачны раўнд у лютым, у якім 24 каманды прымуць удзел у дамашніх і выязных матчах — ключавым элементе спадчыны Кубка Дэвіса. 12 пераможцаў кваліфікацыі забяспечаць сабе прамую пуцёўку ў фінальную частку турніру і далучацца да чатырох паўфіналістаў мінулага года. Яшчэ дзве зборныя, якія будуць абвешчаныя да пачатку кваліфікацыйнага раўнда, атрымаюць wild card.

Фінальны турнір будзе праходзіць па кругавой сістэме з панядзелка па чацвер, а ўсіх 18 удзельнікаў падзеляць на 6 груп. Кожны паядынак будзе ўключаць у сябе тры матчы — два адзіночныя і адзін парны, якія будуць праходзіць у трохсэтавым фармаце. Пераможцы груп, а таксама дзве найлепшыя каманды, якія занялі другія месцы, у пятніцу згуляюць у чвэрцьфінале. У суботу адбудуцца паўфіналы, а ў нядзелю — фінал. Дзве найгоршыя каманды групавога этапу будуць паніжаны ў наступным годзе да ўзроўню занальных груп, астатнія ж, якія не выйшлі ў паўфінал, будуць удзельнічаць у кваліфікацыйным раўндзе ў лютым наступнага сезона.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Даты | Падзеі | Людзі

1 ВЕРАСНЯ

1853 год — нарадзіўся Міхал Федароўскі, польскі і беларускі фалькларыст, этнограф, археолаг. Член Львоўскага этнаграфічнага таварыства, Антрапалагічнай камісіі Акадэміі ведаў у Кракаве, Польскага краязнаўчага таварыства, Кракаўскага нумізматычна-археалагічнага таварыства, Таварыства сяброў навук у Вільні. У 1877—1904 гадах жыў у Заходняй Беларусі. Даследаваў духоўную і матэрыяльную культуру, вывучаў флору і фаўну, збіраў кнігі, гістарычныя дакументы магнацкіх архіваў, творы жывапісу і графікі, фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, праводзіў раскопкі курганоў, старажытных паселішчаў і могільнікаў, збіраў матэрыялы для стварэння археалагічнай карты дагістарычнай Беларусі. Ім сабрана больш за 5 тысяч беларускіх народных песень, каля 10 тысяч прыказак, сотні казак, загадак, народных павер'яў, рэкамендацый народнай медыцыны. Аўтар фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў «Люд беларускі». Памёр у 1923 годзе.

1953 год — быў зроблены першы набор у Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча. Навучальная ўстанова была створана з мэтай выхавання дзяцей воінаў і партызан Вялікай Айчыннай вайны, а таксама сірот, чые бацькі загінулі ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Асноўныя задачы вучылішча: забеспячэнне атрымання суворaўцамі агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама неабходных для выбару прафесіі першасных ведаў і навыкаў ваеннай справы.

1968 год — вакальна-інструментальны ансамбль «Лявоны» на чале з У. Мулявіным упершыню выступіў пад назвай «Песняры».

Дзень пачатку Другой сусветнай вайны (1939—1945). 1 верасня 1939 года фашысцкая Германія напала на Польшчу. У Польшчы гэты дзень адзначаецца як Дзень ветэранаў вайны.

1923 год — у Японіі адбылося Вялікае землетрасенне Канта магнітудай 7,9, якое фактычна знішчыла гарады Токіа і Якагама і забрала жыцці больш як 140 тысяч чалавек.

1958 год — нарадзіўся Сяргей Гармаш, расійскі акцёр тэатра і кіно, артыст маскоўскага тэатра «Сучаснік», народны артыст Расійскай Федэрацыі. Здымаўся ў фільмах «Атрад», «Варашылаўскі стралок», «Каменская», «Пяшчотны ўзрост», «72 метры», «Населены востраў» і іншых.

1983 год — над Сахалінам збіты паўднёвакарэйскі «Боінг» (рэйс 007), які парушыў савецкую мяжу. Самалёт ляцеў па курсе Нью-Ёрк — Сеул. На борце судна знаходзілася 296 пасажыраў і 23 члены экіпажа. Адхіліўшыся ад курсу, лайнер увайшоў у закрытую паветраную прастору СССР і прайшоў над савецкімі ваеннымі аб'ектамі. Прымусіць самалёт да пасадкі на савецкай тэрыторыі не ўдалося, у выніку ён быў збіты знішчальнікам-перахватчыкам. Пры крушэнні ніхто не выжыў. Сярод асноўных версій прычын таго, што адбылося, былі названыя памылка пілотаў і правакацыя з боку спецслужбаў ЗША.

Шаноўнага калегу, загадчыка аддзела мастацкага рэдагавання Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандра АСІПЕНКУ шчыра віншуем з прыгожай круглай датай — 50-годдзем! Зычым моцнага здароўя, бадзёрага настрою, плёну ў працы, здзяйснення мар!
Звяздоўцы.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.17	20.00	13.43
Віцебск —	6.05	19.53	13.48
Магілёў —	6.07	19.51	13.44
Гомель —	6.07	19.45	13.38
Гродна —	6.33	20.15	13.42
Брэст —	6.36	20.13	13.37

Месяц

Поўня 26 жніўня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Фёклы, Андрэя, Мікалая, Цімафея.*
К. *Браніславы.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



З 90-годдзем, з прыгожай круглай датай, шчыра віншуем **Надзею Іванаўну РАЧЫНСКУЮ** з вёскі Галынь Навагрудскага раёна! Зычым быць шчаслівай, ніколі не хварэць, душою не старэць і сто гадоў сустрэць!
Суседкі Галя і Вера.

УСМІХНЕМСЯ

Дзве сяброўкі.
— Трэба зрабіць робата, каб выдзіраў пустазелле і абганяў бульбу на дачы.
— У мяне ёсць такі, але ў яго трэба заліваць гарэлку.

Аб'ява на дзвярах бухгалтэрыі:
«У картрыджы прынтара скончыўся тонар. Зарплаты сёння не будзе!»

Жнівень — час, калі людзі, з якімі ты ў сеціве паўгода абмяркоўваў сусветныя праблемы, раптам пішуць, што заўтра едуць з мамай купляць школьную форму.

— Моцна сумавала?
— Па тваёй вуліцы праехалі 58 машын. З іх 12 — сінія.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3251. Нумар падпісаны ў 19.30 31 жніўня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12